# ПРЭЗІДЭНТ ПРЫНЯЎ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА

**Як паведаміла прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы, 27 верасня 1999 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка прыняў са справаздачай прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С. С. Лінга.**

Кіраўнік урада далажыў аб выніках пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў «пяцёркі», што завяршылася ў сталіцы Казахстана г. Астане, на якім быў разгледжаны пакет дакументаў па далейшаму развіццю і паглыбленню інтэграцыйных працэсаў у адпаведнасці з палажэннямі Дагавора аб Мытным саюзе і Адзінай эканамічнай прасторы ад 26 лютага 1999 года.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь інфармаваў прэзідэнта краіны аб выніках двухбаковых сустрэч са Старшынёй урада Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным і кіраўніком урада Казахстана Нурланам Балгімбаевым.

Сяргей Лінг таксама праінфармаваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб тым, што на пасяджэнні «пяцёркі» падпісаны Пратакол «Аб сумесных дзеяннях дзяржаў — удзельніц пагадненняў аб Мытным саюзе па актывізацыі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і пераадоленню вынікаў фінансава-эканамічнага крызісу». Для канкрэтызацыі асноўных палажэнняў гэтага дакумента і тэрмінаў яго выканання зацверджаны План дзеянняў, што дасць магчымасць рэалізаваць сумесныя меры па захаванню рэжыму свабоднага гандлю і выкананню ўмоў, зафіксаваных у пагадненнях аб Мытным саюзе.

Падпісанае на пасяджэнні Пагадненне «Аб спрошчаным парадку мытнага афармлення тавараў, што перамяшчаюцца паміж дзяржавамі — удзельніцамі Мытнага саюза» прадугледжвае асаблівы мытны рэжым для перамяшчэння тавараў на ствараемых сумесных пунктах пропуску для краін — удзельніц Мытнага саюза, падкрэслівае прэс-служба.

У ходзе гутаркі прэзідэнта і прэм'ер-міністра быў абмеркаваны і шэраг іншых пытанняў дзейнасці ўрада.

**БЕЛТА.**